УДК 398.88+783.083:272(476)

# Рэлігійныя музычна-паэтычныя жанры як феномен традыцыйнай рымска-каталіцкай культуры на Беларусі

**Раманенкава В. І.**
*Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", Мінск*



*Беларуская традыцыйная культура – гэта жанравае багацце і духоўная глыбіня фальклору, які, як вядома, гістарычна і змястоўна-вобразна цесна звязаны з хрысціянствам і рэлігійнымі вераваннямі папярэдніх часоў. Дадзены артыкул грунтуецца на комплексным міждысцыплінарным падыходзе да феномену традыцыйнай рымска-каталіцкай музыкі. Рэлігійныя музычна-паэтычныя жанры даследуюцца ў дадзенай працы як з'ява рымска-каталіцкай музычнай традыцыі на Беларусі, якія існавалі ў папярэдніх стагоддзях і дайшлі да нас у жанрах кантаў, духоўных вершаў і рэлігійных песень.*

*Вывучэнне рэлігійных музычна-паэтычных жанраў дае права лічыць іх адным з важных фрагментаў музычна-гістарычнага зрэзу агульнаеўрапейскай і ўсходнеславянскай традыцыйных культур, а таксама вылучаць іх стылістычныя асаблівасці, якія прадстаўляюць сукупнасць царкоўнай рымска-каталіцкай і праваслаўнай музыкі са свецкай і фальклорнай музычнай творчасцю беларусаў, палякаў, рускіх і ўкраінцаў, перакрыжываных, асіміляваных і ўзаемааб'яднаных на беларускай музычнай глебе.*

***Ключавыя словы:*** *традыцыйная культура, рэлігійная песня, кант, духоўны верш.*

(Искусство и культура. — 2014. — № 4(16). — С. 62-65)

# Religious Poetry and Music Genres as a Phenomenon of the Traditional Roman Catholic Culture in Belarus

**Ramanenkava V. I.**
*Educational establishment «Belarusian State University of Culture and Arts», Minsk*

*Belarusian traditional Culture – this wealth of genres and spiritual depth of folklore which, as is known, historically and figuratively is closely associated with Christianity and religious beliefs of earlier times. This article is based on an integrated interdisciplinary approach to the phenomenon of the traditional Roman Catholic music. Religious poetry and music genres are explored in this paper as a phenomenon of the Roman Catholic musical tradition in Belarus, which existed in previous centuries and came to us in the genres of chants, spiritual poems and religious songs.*

*The study of religious musical and poetic genres allows to consider them one of the most important fragments of musical-historical cultural layer of European and East Slavic traditional cultures, and allocate their stylistic features, which represent the totality of the Roman Catholic Church and the Orthodox and secular music with folk music of Belarusians, Poles, Russian and Ukrainians, assimilated and mutually combined by Belarusian musical tradition.*

***Key words:*** *traditional culture, religious song, chant, spiritual verse.*

(Art and Culture. — 2014. — № 4(16). — P. 62-65)

Традыцыйная культура – важнейшая частка духоўнай культуры народа – надзвычай добра захавалася не толькі ў памяці беларусаў, але і ў актыўным побыце, адыграла вялікую ролю ў нацыянальнай самасвядомасці, у развіцці літаратуры і мастацтва; яна і сёння плённа ўплывае на працэсы нацыянальнага адраджэння.

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* lveronikaro@mail.ru – **В. І. Раманенкава**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Традыцыйная рымска-каталіцкая музычна-паэтычная культура прыцягнула ўвагу навукоўцаў прыкладна ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Напачатку яна разглядалася ў кантэксе фальклору ў цэлым і не вылучалася як асобная адзінка. У саракатомніку "Lud. Jego zwyczaje, piesni etc"[1] О. Кольберг, адзін з першых этнографаў, пачаў вылучаць рэлігійныя песні як самастойны фальклорны жанр, звяртаючы ўвагу на гістарычныя і гімналагічныя[2] крыніцы музычнай спадчыны. Прыкладна з 1970 г. традыцыйнай рэлігійнай музыкай пачалі займацца на ўзроўні навукова-аналітычных даследаванняў на базе Інстытута Касцёльнай Музыкалогіі[3].

З другой паловы XX стагоддзя традыцыйныя рэлігійныя музычныя жанры актыўна вывучаюцца беларускімі (Л. Касцюкавец, Л. Баранкевіч, Л. Густова), украінскімі (О. Гнацюк, О. Зосім), польскімі і славацкімі (Б. Барткоўскі (B. Bartkowski), А. Зола (A. Zoła), П. Жэнюх (P. Žeňuch), Д. Штэрн (D. Stern) даследчыкамі. Найбольш знакавымі даследаваннямі традыцыйнай рэлігійнай музыкі рымска-каталіцкай царквы з'яўляюцца працы польскіх навукоўцаў А. Золы і ксяндза Б. Барткоўскага.

Дадзены артыкул грунтуецца на комплексным міждысцыплінарным падыходзе да феномену традыцыйнай музыкі, які ўключае ў сябе параўнальна-гістарычны і кампаратыўна-аналітычны метады даследавання.

Мэта даследавання – характарыстыка рэлігійных музычна-паэтычных жанраў рымска-каталіцкай спеўнай традыцыі на Беларусі.

Паводле дэфініцыі выбітнага расійскага этнолага і сацыёлага С. Лур'е, традыцыя – гэта штосьці, што знаходзіцца ў пастаянным працэсе змены. Змены – як малой, так і глабальнай – звязанай са зменамі ўсяго каркаса грамадства. У традыцыі прысутнічае як крэатыўны (творчы) складнік, так і кансерватыўны. Характар змяненняў у традыцыйным грамадстве не самавольства, ён зададзены традыцыяй знутры [1]. Такім чынам, грунтуючыся на дадзеным азначэнні, можам сцвярджаць, што рэлігійная бытавая традыцыя – гэта адзінка, якая пастаянна змяняецца і ўбірае ў сябе культурныя здабыткі мінулых пакаленняў і выпрацоўвае ўласна свае – сучасныя традыцыі.

**Рэлігійныя музычна-паэтычныя жанры** даследуюцца ў дадзенай працы як з'ява рымска-каталіцкай музычнай традыцыі на Беларусі, якія існавалі ў папярэдніх стагоддзях і дайшлі да нас у жанрах кантаў, духоўных вершаў і рэлігійных песень.

Неабходна звярнуць увагу на такую з'яву як пранікненне фальклярыстычных ці простых народных музычных элементаў да сакральнай музыкі. На працягу стагоддзяў у літургіі рымска-каталіцкай царквы спяваўся выключна толькі грыгарыянскі харал. Харальныя спевы былі настолькі складанымі, што іх маглі выконваць толькі тыя людзі, якія мелі адпаведную падрыхтоўку. Гэта значыць, што вернікі, якія ўдзельнічалі ў літургіі, слухалі спевы царквы, запаміналі меладычную лінію, наколькі ім дазвалялі іх музычныя здольнасці, і потым асімілявалі іх у "камфортны" просты рэлігійна-бытавы спеў. Даследаванні[4], якія былі праведзены па выяўленні элементаў грыгарыянскага харала ў рэлігійных песнях, даказваюць той факт, што першакрыніцамі многіх рэлігійна-бытавых мелодый з'яўляецца грыгарыянскі харал.

Папа Пій XII у сваёй энцыкліцы "Musicae Sacra" піша: "У дадатак да песень, цесна звязаных са святой літургіяй, у царкве ёсць рэлігійныя народныя песні, якія выконваюцца, у асноўным, на простай роднай мове і маюць мелодыі, падобныя да літургічных (напрыклад: «Анёл Панскі», «Перад Тваімі вачыма, Пане», «Божа вечны, Божа жывы» і інш.)"[5] [2, s. 48].

***Рэлігійна-бытавая песня*** – гэта фальклярыстычны жанр, які па сваім значэнні звязаны з літургічным годам, абрадамі,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

[1] "Lud. Jego zwyczaje, sposób życia, mowa, podania, przysłowia, obrzędy, gusła, zabawy, pieśni, muzyka i tańce": у 40-тамах. Зборнік, выдадзены па выніках фальклярыстычных экспедыцый Оскара Кольберга па Польшчы, Беларусі (Літве) і Украіне. Kolberg, O. Dzieła wszystkie Białoruś-Polesie. – Wrocław–Poznań: Polskie Towarzystwo Ludoznawcze, 1968. – T. 52. – 572 s.

[2] Тут мы маем на ўвазе выканаўчы метад даследавання.

[3] Інстытут музыкалогіі Каталіцкага ўніверсітэта ў Любліне (Польшча).

[4] Даследаванні Барткоўскага Б. і Золы А. ў галіне прысутнасці элементаў грыгарыянскага харала ў рэлігійных песнях былі сканцэнтраваныя на фундаментальных дэтэрмінантах музыкі: стыль, форма, мелодыя, танальнасць, метр, рытм, выканальніцтва [2, с. 346].

[5] З дадзенага тэзісу вынікае абгрунтаванне варыянтаў меладычнай разнастайнаці той ці іншай меладычнай лініі.

звычаямі (рэлігійнымі і, у меншай ступені, свецкімі). Галоўнай рысай, якая характарызуе рэлігійныя песні, з'яўляецца паэтычны тэкст рэлігійнай накіраванасці. Звычайна (але не заўсёды) тэкст мае страфічны ўклад і, часта, простыя рэфрэны.

Рэлігійныя песні і іх функцыянаванне, згодна з высновамі А. Золы, вызначаюцца наступным чынам:

• пэўныя сітуацыі літургічнага года (напрыклад: песні перыяду Адвэнту[6], калядкі, велікодныя песні і інш.);

• сувязь рэлігійных песень з абрадамі (напрыклад: пахаванне, спевы пры "Гробе Панскім" і інш.);

• сувязь з літургічнымі звычаямі (напрыклад, спевы ў чацвер, пятніцу);

• спевы, якія не паказваюць ніякіх сувязяў з тымі ці іншымі сітуацыямі (напрыклад, песні "на Дзяды");

• кантэкст свецкіх абрадаў і звычаяў (напрыклад, вяселле).

Рэлігійныя песні могуць выконвацца як у царкве, так і па-за яе межамі. К. Зінкевіч[7] апавядае: "Я заўсёды спявала дома, у полі і найбольш спявала рэлігійныя песні". Гэтыя словы яшчэ раз пацвярджаюць, што рэлігійныя песні трывала ўвайшлі ў паўсядзённае жыццё чалавека. Акрамя таго, збіраючы матэрыял для нашага даследавання сярод вернікаў амаль у кожнай вясковай хаце, мы сустрэлі наяўнасць 19-вечных спеўнікаў, якія змяшчаюць у сабе рэлігійныя песні.

Традыцыйныя рэлігійныя творы часта нідзе не былі запісаныя, але функцыянавалі ў вуснай традыцыі. Некаторыя з песень былі запісаныя ў прыватных рукапісных спеўніках або друкаваліся ў так званых кантычках.

Такім чынам, рэлігійныя песні былі шырока распаўсюджаны на беларускай зямлі на працягу доўгага часу і заўсёды ішлі поруч з польскай музычнай традыцыяй. Таму не дзіўна, што сёння, падчас збору музычнага матэрыялу для нашай працы, большасць песень была выканана на польскай або беларускай мове з вялікай колькасцю асімляваных польскіх слоў. Рымска-каталіцкія рэлігійныя песні – цікавая і мала вывучаная з'ява беларускай традыцыйнай культуры.

З XVI–XVIII стст. у Беларусь актыўна стала пранікаць ***кантавая культура*** Усходняй Еўропы (кант – шырока вядомая ў Цэнтральнай і Заходняй Еўропе вакальна-харавая песня-гімн).

Канты – гэта музычна-паэтычныя харавыя песні, мелодыка якіх аб'ядноўвае ў сабе рысы старажытнага знаменнага распеву і народна-песеннай творчасці. Стылістыка канта, у сваю чаргу, аказала ўздзеянне на развіццё як царкоўнай, так і народнай музычнай творчасці. Вылучаюць свецкія канты (уласна канты), такія як "Из Слуцка, из-за Клецка", "Ой, коли б, коли московли пришли" і рэлігійныя канты (псалмы) – "Аллелюя! Бог ускрос!", "Нова радасць стала" і інш.

Кант (лат. cantus – песня, спевы) – бытавая акапэльная вакальна-харавая песня-гімн. Для музычна-паэтычнай стылістыкі канта Л. Касцюкавец вылучыла насупныя характарыстыкі:

• сілабічны прафесійны (аўтарскі) верш з рыфмай;

• страфічная арганізацыя і яе састаўляючыя часткі – строфы;

• тыпічная бытавая танцавальная мелодыка і рытміка;

• стэрэатыпізаваныя кадэнцыйныя і экспазіцыйныя звароты;

• секвенцыйны метад разгортвання;

• некалькі дзесяткаў улюбёных кантавых мелодый;

• танізацыя мелодыкай сілабікі і зараджэнне сілабатонікі;

• лінеарны прынцып фактурнага мыслення;

• крышталізацыя функцыянальна-ладавай гармоніі ў канцы меластроф з перавагай натуральна-ладавай у сярэдзіне;

• мужчынскае харавое (ансамблевае) выкананне [3, с. 47].

Сярод насельніцтва шырокае распаўсюджанне атрымалі канты, якія выконваліся падчас святкавання Вялікадня, масавыя ў сваёй аснове, дынамічныя, яскравыя, святочныя. У іх адлюстраваны чалавек сваёй эпохі. Бог і святыя ў такіх кантах прадстаўлены як простыя людзі.

Апрача рэлігійных песень і кантаў на беларускай зямлі распаўсюджаны яшчэ адзін

[6] У каталіцкай Царкве Адвэнт распачынае новы год літургічны. Слова adventus паходзіць ад advenire, што азначае прышэсце (gr. Epiphania, parousia). Адвэнт – час радаснага чакання Нараджэння Пана.

[7] Крысціна Зінкевіч (1936 г.н.) – парафіянка касцёла Святой Тройцы ў Докшыцах Віцебскай вобласці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жанр рэлігійнага фальклору – духоўныя вершы.

***Духоўнымі вершамі*** называюць эпічныя і лірычныя народныя песні рэлігійнага зместу. Духоўныя вершы ўяўляюць сабой маральныя аксіёмы хрысціянства ў выглядзе яркіх сюжэтаў, якія абагульняюць сэнс і значэнне разнастайных жыццёвых сітуацый. Змест духоўных вершаў носіць багаслоўскі характар, але выражаецца простай народнай мовай, з уласцівымі фальклору вобразамі, матывамі, рытмамі, маўленчымі формуламі.

Першыя запісы, якія дайшлі да нас, адносяцца да XV стагоддзя, але найбольшае распаўсюджанне духоўныя вершы атрымалі пачынаючы з XVII стагоддзя. Яны, хутчэй за ўсё, маюць змешаны тып узнікнення: рускі эпічна-былінны і еўрапейскі лірыка-песенны.

Асноўная функцыя верша – спалучыць свет хрысціянскай кнігі са светам народных уяўленняў, патлумачыць складаныя тэксты зразумелай мовай. Самі духоўныя вершы ў пераважнай большасці не былі канфесійнымі – адны і тыя ж псалмы выкарыстоўваліся рознымі рэлігіямі. Духоўныя вершы мелі каляндарную прымеркаванасць – гэта былі песні, якія можна спяваць ў пост ці святы. Прыкладам можа служыць духоўны верш, запісаны намі ад парафіян вёскі Дунілавічы Лідскага раёна "Слава Богу за ўсё".

Г. Фядотаў адзначае: "Беларускія духоўныя вершы ў асноўным напісаны ў форме рыфмаванай і сілабічнай. У гэтых творах адчуваецца ўплыў польскай культуры. Ёсць нават вершы, якія проста перакладзеныя з польскай мовы" [4, с. 87]. На падставе такога факту можна сцвярджаць, што беларускія духоўныя вершы змяшчаюць у сабе элементы ўсходняй і заходняй культур, як каталіцкай, так і праваслаўнай.

**Заключэнне.** Вывучэнне рэлігійнага зместу духоўных вершаў вядзе ў самую глыбіню народнага побыту, да тых вышэйшых яго пластоў, дзе ён цесна сутыкаецца з духоўным светам.

Даследаванне рэлігійных музычна-паэтычных жанраў выкрывае цэлы пласт традыцыйнай музычнай культуры беларусаў. Гэта вобласць традыцыйнай рэлігійнай спадчыны паказвае, з аднаго боку, яе прыналежнасць да літургічнай культуры, а з другога – да народнай, фальклорнай.

Комплекснае вывучэнне рэлігійных музычна-паэтычных жанраў дае права лічыць іх адным з важных фрагментаў музычна-гістарычнага зрэзу агульнаеўрапейскай і ўсходнеславянскай традыцыйных культур, а таксама вылучаць іх стылістычныя асаблівасці, якія прадстаўляюць сукупнасць царкоўнай рымска-каталіцкай і праваслаўнай музыкі са свецкай і фальклорнай музычнай творчасцю беларусаў, палякаў, рускіх і ўкраінцаў, перакрыжываных, асіміляваных і ўзаемааб'яднаных на беларускай музычнай глебе.

Рэлігійныя песні, канты, духоўныя вершы – музычна-паэтычныя жанры традыцыйнай рэлігійнай культуры, якія з'яўляюцца здабыткам не толькі беларускай музычнай спадчыны, але і прадстаўляюць сусветную каштоўнасць.

## ЛІТАРАТУРА


1. Лурье, С. В. Историческая этнология: учеб. пособие для вузов / С. В. Лурье. – М.: Аспект Пресс, 1997. – С. 24.
2. Encyklika Musicae sacrae disciplina 1955 r. / Wiadomości Diecezjalne. – Katowice: Organ Urzędowy Archidiecezji Katowickiej, 1957-1961. – 83 s.
3. Костюковец, Л. Ф. Стилистика канта и ее претворение в белорусской народной песне: в 2 кн. / Л. Ф. Костюковец. – Минск: Белорусская государственная академия музыки, 2006. – Кн. 1. – 190 с.
4. Федотов, Г. П. Стихи духовные (Русская народная вера по духовным стихам) / Г. П. Федотов. – М.: Прогресс, Гнозис, 1991. – 124 с.


*Паступіў у рэдакцыю 11.07.2014 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ